Important Bird Area: Balota Jel`nia

© В. Фенчук

Code: BY002

Central coordinates: 55°34' N 27°55' E

Location: Vitebskaya voblast: Miyory region, Sharkaushchyna region

Area: 27948 ha

IBA Criteria: A1, B2, A4i

National conservation status: большая частка ТВП з’яўляеца ландшафтным заказнікам рэспубліканскага значэння «Ельня»

International conservation status: ТВП міжнароднага значэння, утворана ў 1998 годзе. Рамсарская тэрыторыя з 2002 г. (крытэрыі 1, 3, 5, 6). Ключавая батанічная тэрыторыя

Site description:

Буйнейшы ў Беларусі комплекс верхавых і пераходных балот са шматлікімі азёрамі, якія прыдаюць разнастайнасць аднатоннаму ландшафту. Па ўсім балоце раскіданы невялікія астравы, пакрытыя мелкаліставымі і яловымі лясамі. Большая частка балотнага масіву зарасла невысокай хвояй, але сустракаюцца і даволі значныя адкрытыя ўчасткі са шматлікімі дробнымі азёрамі і вокнамі чыстай вады. Расліннасць на балотнай частцы заказніка характэрная для верхавых балот і прадстаўлена хваёва-хмызнякова-сфагнавымі і хмызнякова-сфагнавымі

супольнасцямі.

Балота Ельня размешчана на водападзеле рачных басейнаў. Цэнтральная яго частка ўзвышаецца над перыферыйнымі ўчасткамі на 7 метраў. Глыбіня тарфяной залежы ў сярэднім складае 3,8, а месцамі дасягае 8,3 метра. З балотнага масіву выцякаюць тры ракі, а ў яго не ўпадае ніводнай. На тэрыторыі балота налічваецца больш за 100 азёр, якія ўяўляюць сабой рэшткі існаваўшага некалі аднаго вялікага возера. Большасць з іх злучана паміж сабой рэкамі і пратокамі. Аснову воднага сілкавання балота складаюць грунтовыя воды і ападкі.

У выніку меліярацыі прылягаючых тэрыторый і часткі балота адбыліся істотныя змены гідралагічных умоў комплексу. Пракладка шматлікіх каналаў і выраўноўванне рэк прывялі да зніжэння ўзроўню грунтовых вод, што стала адной з асноўных прычын практычна штогадовых буйных пажараў на балоце. У апошнія гады на меліярацыйных каналах на балоце было пабудавана больш за 40 дамбаў, што прывяло да падняцця узроўня вады.

У сувязі з цяжкай даступнасцю і спецыфікай ландшафтаў (каля 60% лесу расце на балоце, а самі лясы характарызуюцца нізкай прадукцыйнасцю) тэрыторыя выкарыстоўваецца чалавекам абмежавана. Лесаэксплуатацыйныя работы вядуцца ў асноўным па перыферыі балотнага масіву і на мінеральных астравах, сельскагаспадарчая дзейнасць адсутнічае. Тэрыторыя выкарыстоўваецца як для прамысловых нарыхтовак, так і для аматарскага збору грыбоў і ягад. На азёрах мясцовае насельніцтва ловіць рыбу.

Флора сасудзістых раслін уключае 405 відаў, якія адносяцца да 233 радоў, 83 сямейств, 6 класаў, 5 аддзелаў. У тым ліку 5 відаў хвашчоў, 3 - дзеразы, 11 - папаратнікоў, 3 - голанасенных і 383 - кветкавых (пакрытанасенных), у тым ліку 103 – аднадольных і 280 - двухдольных раслін.

На тэрыторыі заказніка "Ельня" выяўлена 23 віда дрэў, 20 відаўхмызнякоў, 350 відаў травяністых раслін. Акрамя таго, у межах заказніка выяўлена і ідэнтыфікавана 86 відаў мохападобных і 50 відаў лішайнікаў.

Habitats:

Верхавыя балоты (у тым ліку пашкоджаныя пажарамі) – 65,7%, лясы – 24% (у тым ліку: хваёвыя – 8,7%, шырокалісцёвыя – 8,7%, дробналісцёвыя – 14,6%), хмызнякі і рэдкалессе – 5,8%, іншыя землі – 4,5%.

Birds:

На тэрыторыі заказніка сустракаецца 117 відаў птушак, 25 з якіх занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Характэрная рыса балотнага масіву Ельня – наяўнасць разрэджаных калоній кулікоў на балоце і калоній чайкавых на азёрах. Ельня – месца гнездавання птушак, тыповых для комплексаў верхавых балот: чорнаваллёвага гагача *Gavia arctica*, пардвы *Lagopus lagopus*, залацістай сеўкі *Pluvialis apricaria*, сярэдняга кулёна *Numenius phaeopus* і куліка-селянца *Tringa nebularia*. Рэдкія для Беларусі ўвогуле, яны сустракаюцца тут у значнай колькасці. Акрамя іх на балоце гняздуюцца сокал-дрымлюк *Falco columbarius* і арол-вужаед *Circaetus gallicus*. Колькасць найбольш рэдкіх і значных відаў птушак прыведзена ў табліцы.

Балотны масіў Ельня мае вялікае значэнне як месца прыпынку мігруючых гусей, качак і, асабліва, жураўлёў на вясновых і восеньскіх пралётах. У гэты час на вадаёмах звычайныя і шматлікія гусі-гуменніцы *Anser fabalis*, белалобыя гусі *Anser albifrons*, качкі-свіцьвы *Anas penelope*, качкі-чыркі *Anas querquedula*; сустракаюцца таксама шэрая гусь *Anser anser*, гусь-піскулька *Anser erythropus*, качка-шылахвостка *Anas acuta*, савукі *Mergus sp*.

Other animal groups:

Фауна наземных пазваночных уключае 7 відаў земнаводных, 5 відаў паўзуноў, 31 від млекакормячых (большасць з іх пражывае на перыферыйных участках балота ці наведвае яго ў пошуках корму). Адзначаецца высокая колькасць гадзюкі звычайнай *Vipera berus*.

Populations of IBA trigger species:

Species	Season	Quality of estimate	Period	Quality of estimate	Trends (2000-2011)	IBA criteria
Bean goose *Anser fabalis*	P	500-1000 individuals	2005-2011	Poor		

Species	Season	Quality of estimate	Period	Quality of estimate	Trends (2000-2011)	IBA criteria
White-fronted goose *Anser albifrons*	P	2000-3000 individuals	2005-2011	Poor		
Willow grouse *Lagopus lagopus*	B	20 breeding pairs	2005-2011	Medium	↓	
Black-throated diver *Gavia arctica*	B	2-5 breeding pairs	2005-2011	Poor	↔	
Black stork *Ciconia nigra*	B	3-4 breeding pairs	2005-2011	Poor	↔	
Short-toed eagle *Circaetus gallicus*	B	0-2 breeding pairs	2005-2011	Poor	↓	
Osprey *Pandion haliaetus*	P	+	2005-2011	Poor		
Merlin *Falco columbarius*	B	10-20 breeding pairs	2005-2011	Poor		
Hobby *Falco subbuteo*	B	5 breeding pairs	2005-2011	Poor	↔	
Crane *Grus grus*	B	30-50 breeding pairs	2005-2011	Medium	↓	B2
Crane *Grus grus*	P	1600-4000 individuals	2005-2011	Good	↔	A4i
Golden plover *Pluvialis apricaria*	B	50-120 breeding pairs	2005-2011	Medium	↑	
Black-tailed godwit *Limosa limosa*	B	30-50 breeding pairs	2005-2011	Medium	↔	A1

Species	Season	Quality of estimate	Period	Quality of estimate	Trends (2000-2011)	IBA criteria
Curlew *Numenius arquata*	B	30-35 breeding pairs	2005-2011	Medium		
Curlew *Numenius arquata*	B	10-30 breeding pairs	2005-2011	Medium	↓	B2
Greenshank *Tringa nebularia*	B	30-50 breeding pairs	2005-2011	Medium		
Common gull *Larus canus*	B	60-90 breeding pairs	2007-2011	Good	↓	

Other biodiversity:

Звяры: барсук *Melesmeles.*

Птушкі: гусь-піскулька *Anser erythropus,* качка-шылахвостка *Anas acuta,* савук-луток *Mergellus albellus,* вялікі савук *Mergus merganser,* арлан-белахвост *Haliaeetus albicilla,* арол-маркут *Aquila chrysaetos,* палявы лунь *Circus cyaneus,* малы арлец *Aquila pomarina,* стучок *Lymnocryptes minimus,* жоўтагаловы дзяцел *Picoides tridactylus,* балотная сава *Asio flammeus,* пугач *Bubo bubo.*

Насякомыя: Шчыгрынавы жужаль *Carabuscoriaceus*, рашэцісты жужаль *Carabus cancellatus*, жужаль менетрые *Carabusmenetriesi,* залацістаямачны жужаль *Carabus clathratus,* бліскучы жужаль *Carabusnitens,* аксамітніца юта *Oeneisjutta,* тарфянікавая жаўтушка*Coliaspalaeno,* альпійская перламутраўка *Clossianathore.*

Расліны: баранец звычайны*Huperziaselago*, бяроза карлікавая *Betulanana*, гімнакалея ўздутая *Gymnocoleainflata*, вярба чарнічная *Salixmyrtilloides*, касач бязлісты *Irissibirica*,журавіны дробнаплодныя *Oxicoccusmicrocarpus*, цыбуля мядзведжая *Alliumursinum*, марошка прысадзістая *Rubuschamaemorus*, увярэднік скіпертападобны *Pedicularissceptrum-carolinum*, асака малакветкавая *Carex pauciflora*, сфагнум мяккі*Sphagnummolle*, шпажнік чарапіцавы*Gladiolusimbricatus*, лобарыя лёгачная *Lobaria pulmonaria.*

Threats:

Паніжэнне ўзроўню грунтовых вод у выніку пракладання каналаў сярод балота, выраўноўвання рэк і асушэння перыферыйных участкаў балота. Парушэнне гідрарэжыму прыводзіць да пачашчэння пажараў, змянення відавога саставу флоры, зарастання адкрытых участкаў балот хмызнякамі і лесам.

Выпальванне расліннасці і пажары. Пажары і паніжэнне ўзроўню грунтовых вод аказваюць істотны ўплыў на стан папуляцый птушак, якія тут гняздуюцца і спыняюцца падчас міграцый. У першую чаргу, у выніку пажараў змяншаецца плошча тыповых балотных экасістэм, а знішчэнне журавін значна змяншае кармавую базу для многіх відаў птушак.

Фактар неспакою. У апошнія гады рыбаловы і паляўнічыя пачалі ўсё часцей наведваць азёры. Гэта прыводзіць да разбурэння гнёздаў многіх відаў птушак, у тым ліку і занесеных у Чырвоную кнігу. Балота пачынае губляць сваю значнасць як месца канцэнтрацыі мігрыруючых гусей і жураўлёў. Адна з прычын такога становішча – зніжэнне ўзроўню грунтовых вод, што зрабіла балота больш даступным для чалавека вясной.

Нерэгламентаваны збор журавін прыводзіць да сур’ёзнага пашкоджання наглебавага покрыва і з’яўляецца яшчэ адным фактарам парушэння спакою жывёл.

Recommendations for the conservation:

Для вырашэння пералічаных экалагічных праблем неабходна зрабіць шэраг захадаў:

- аптымізаваць гідралагічны рэжым балотнага комплексу шляхам перакрыцця каналаў, па якіх вада выцякае з балота;
- забараніць асушальныя работы як унутры, так і на перыферыі заказніка;
- арганізаваць кантроль за выкананнем забароны на паляванне на азёрах, якія з’яўляюцца буйнейшымі месцамі адпачынку мігрыруючых гусей;
- абмежаваць ці забараніць рыбную лоўлю на азёрах, дзе гняздуюцца рэдкія віды птушак;

References:

Асабістыя паведамленні: Дамброўскі В.Ч., Івановскі У.В., Коваленок В.,Левы

С.В., Лукшыц В.У., Якавец М.М.

Ключевые ботанические территори Беларуси / Под ред. О.М. Масловского, Г.А. Пронькиной. – М.-Мн. -: Бестиор, 2005. – 80 с.

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Бірукоў В.П., Дарафееў А.М., Іваноўскі У.В., Казлоў В.П., Кузьменка У.Я., Скуратовіч А.М.).

Сушко Г.Г., Шкатуло В.В., Борок И.И. Редкие и охраняемые виды насекомых обитателей верховых болот Белорусского Поозерья // Красная книга Республики Беларусь: состояние, проблемы, преспективы: материалы международной научной конференции. – Витебск: УО “ВГУ им. П.М. Машерова”, 2011., с. 171-173.

Флора и растительность ландшафтного заказника «Ельня» / Д.Г. Груммо, О.В. Созинов, Н.А. Зеленкевич [и др.]; под ред. Н.Н. Бамбалова; Нац. акад. Наук Беларуси, Ин-т экспериментальной ботаники. – Минск: Минкстиппроект, 2010. – 200 с.: ил.

Яковец Н.Н. Мониторинг некоторых видов ржанкообразных заказника “Ельня”, занесенных в Красную книгу Республики Беларусь. // Биологическое разнообразие Белорусского Поозерья: современное состояние, проблемы использования и охраны: Материалы II Международной научно-практической конференции, Витебск, 2008 г., с. 281-283.

Authors : Левы С.В.

---

* *Использование размещенной здесь неопубликованной информации для научных публикаций без письменного соглашения ее авторов запрещено. В случае использования части контента или страницы целиком на других интернет-ресурсах, обязательна ссылка на авторов и сайт iba.ptushki.org*